# Ты першым стрэў свабоду

**Перагортваючы ў вольны час свой асабісты архіў, я выпадкова натрапіў на матэрыялы трыццацігадовай даўнасці касцюковіцкага краязнаўцы Уладзіміра Раманавіча Ламінскага аб вызваленні Хоцімска з фашысцкай няволі, якія ён сабраў са звестак архіва і Міністэрства абароны СССР, з перапіскі з генералам П. А. Церамавым і яго мемуараў «Палаючыя берагі» (Ваенвыдат, 1965 г.), а таксама з перапіскі з Героем Савецкага Саюза Л. Д. Зубавым і з асабістых гутарак з асобнымі воінамі-землякамі — былымі байцамі 108-й стралковай дывізіі.**

**Не магу сцвярджаць, у якой ступені і колькі яны выкарыстоўваліся ў друку, але мяркую, што ў нашых чытачоў, асабліва сучаснага пакалення, выклікаюць інтарэс.**

**Леў СЕВЕЛЕЎ.**

Хоцімск — першы раённы цэнтр на беларускай зямлі, вызвалены Савецкай Арміяй ў перыяд яе перамоганоснага шэсця на захад. У баях за горад  удзельнічалі воіны 108-й Чырвонасцяжнай дывізіі палкоўніка Пятра Аляксеевіча Церамава якая ў той час уваходзіла ў склад 50-й арміі пад камандаваннем генерала І. В. Болдзіна.

...У ноч на 19 верасня 1943 года разведчыкі 539-га палка, якім камандаваў палкоўнік Анатоль Арцёмавіч Грэчка, устанавілі, што праціўнік пачаў адыход.

Камдыў П. А. Церамаў далажыў аб гэтым камандарму і атрымаў загад: праследаваць адступаючага ворага. Націскаючы на праціўніка, нашы палкі з ходу фарсіравалі Іпуць і з баямі рухаліся да Хоцімска.

25 верасня часці арміі былі ўжо на рубяжы Малая Ліпаўка — Узлогі. Досвіткам пазваніў генерал І. В. Болдзін. Ён паставіў задачу: акружыць і знішчыць фашыстаў у раёне Хоцімска. Дывізіі прыдаваўся танкавы полк і полк гвардзейскіх мінамётаў-«кацюш».

Камандарм гаварыў П. А. Церамаву:

— Перадайце, палкоўнік, усяму асабаваму саставу, што Ваенны савет арміі ўпэўнены, што ў баях за Хоцімск ваша дывізія будзе дзейнічаць так жа рашуча і смела, як і ў дні баёў за плацдарм на рацэ Дзясна. — Затым менш афіцыйным тонам дадаў:

— І ўлічыце: згодна даных партызан, гітлераўцы сагналі ў горад моладзь з бліжэйшых населеных пунктаў для адпраўкі на фашысцкую катаргу. Дзейнічайце рашуча, каб выратаваць людзей і не даць ворагу разбурыць горад.

Гэтыя словы камандуючага палітработнікі, камуністы і камсамольцы данеслі да кожнага салдата. Рэдактар дывізійнай газеты маёр Гаплеўскі выпусціў лістоўку — палымяны заклік да воінаў-вызваліцеляў. Ва ўсіх ротах і на батарэях былі праведзены кароткія мітынгі.

— Мы даўно чакалі гэтага дня, — гаварыў старшы сяржант Сяргей Ягоравіч Чумакаў. — І вось мы на мяжы роднай Беларусі. Апраўдаем давер’е народа! Вызвалім і выратуем ад разбурэння Хоцімск! Вы ж бачыце, таварышы, што гэтыя звяры робяць...

У ар’ергардах нямецка-фашысцкіх часцей дзейнічалі групы факельшчыкаў. Пры адыходзе яны спальвалі ўсё, а што не магло гарэць, — узрывалі. Сапёры знаходзілі

спецыяльныя прыстасаванні: акуратны блакітны футлярчык з прыгожай жоўтай галоўкай, вушкам з дзірачкай для цвіка, белы шнурок... Цацка, як быццам. А цягані за шнурок — і хата гарыць.

Дывізія ішла па «зоне пустыні». Толькі чорныя шкілеты печаў напаміналі, што тут жылі нядаўна людзі.

Тады ў 108-й дывізіі служыла многа байцоў і камандзіраў з Беларусі. Яны былі лепшымі агітатарамі.

Хоцімск быў ператвораны фашыстамі ў моцна ўмацаваны апорны пункт. Рашэнне камдыва П. А. Церамава зводзілася да наступната: адным палком абыйсці горад, адрэзаць праціўніку шлях да адступлення. Прычым гэты ўдар нанесці некалькі раней атакі астатніх нашых часцей.

Два палкі авалодалі Альшовам з прылягаючай высоткай і вялі моцны агнявы бой, маючы свае перадавыя падраздзяленні ў кіламетры ад горада. Полк палкоўніка Грэчкі, умела манеўруючы і абыходзячы вузлы супраціўлення з поўначы, фарсіраваў раку Бесядзь і авалодаў заходняй ускраінай Хоцімска. Грэчка паведаміў аб гэтым па радыё і дадаў, што 2-я стралковая рота з танкістамі знішчыла на захад ад горада мінамётную батарэю. Палкоўнік дакладваў Церамаву:

— Матэрыяльная частка праўцюжана танкамі. Палонныя мінамётчыкі паказалі, што гадзіну назад з Хоцімска выведзена калона — больш трохсот мірных жыхароў, пераважна жанчын і моладзі.

П. А. Церамаў загадаў пасадзіць на танкі аўтаматчыкаў, дагнаць калону і вызваліць угнаных. Адным батальёнам заняць абарону на рацэ, каб не выпусціць ніводнага немца з горада. Астатнімі сіламі наступаць да цэнтра Хоцімска.

У гэты момант 108-я дывізія атрымала падтрымку суседа — 110-й дывізіі, якой камандаваў палкоўнік Тарасаў.

Нямецкае камандаванне арганізавала контратаку ва фланг 108-й дывізіі. Гэты ўдар і прыняла на сябе 110-я.

Адчуваючы за спіною нашы сілы, немцы аслабілі агнявое супраціўленне на ўсходняй і паўднёвай ускраінах. Танкі, гарматы суправаджэння з трохкіламетровай дыстанцыі адкрылі агонь. Пад яго прыкрыццем два батальёны 444-га палка (камандзір маёр Ягор Давыдавіч Гасан, ураджэнец Беларусі), пайшлі ў наступленне.

Услед за пяхотай пратрасіравалі напрамак руху танкаў, абазначыўшы сцяжкамі праходы ў мінных палях перад Хоцімскам. У гэтай аперацыі вызначыліся сапёры сяржанта Леаніда Дзмітрыевіча Зубава — цяперашняга Героя Савецкага Саюза. З групай сапёраў ён пад моцным агнём праціўніка зрабіў праходы для танкаў і гэтым забяспечыў іх бой за горад. Бясстрашны воін быў тройчы паранены. У выніку мужнасці сапёраў танкі ўвайшлі ў горад без страт.

Камандзір 444-га палка Гасан стварыў штурмавыя групы, і бой працягваўся амаль за кожны дом. У гэтым баі лейтэнант Краўчанка, які камандаваў штурмавой групай, смелым браском кінуўся к дому і ручнымі гранатамі знішчыў агнявую кропку праціўніка, з якой нямецкі кулямётчык перакрываў вуліцу агнём. Яго параніла. Ён упаў. Парторг роты Цхададзе і кулямётчык Плешкаў адцягнулі яго ў падвал і пакінулі на прыгляд мясцовых жыхароў. Цхададзе ўзначаліў групу, а Плешкаў агнём кулямёта падтрымаў штурмуючых.

З даху ўдарыў кулямёт. Парторг даў сігнал танку і паказаў цэль. Наводчык першым жа стрэлам знёс дах дому разам з фашысцкім кулямётчыкам.

Так, узаемадзейнічаючы, штурмавыя групы прасоўваліся да цэнтра гарадка. Пасля трэцяй атакі ўварваўся на паўночную ўскраіну 407-ы полк Аляксея Аляксандравіча Рычкова.

Да камдыва прывялі палоннага нямецкага афіцэра. Церамаў прапанаваў яму вярнуцца да сваіх і растлумачыць, што гарнізон акружаны шчыльным кальцом, і далейшае супраціўленне — лішняя кроў. Спачатку той адмаўляўся, маўляў, яму не павераць, а потым згадзіўся. Але пасля яго ўходу напружанне бою не знізілася.

Пасля шматгадзіннага жорсткага бою, к 18 гадзінам 26 верасня 1943 года Хоцімск быў вызвалены. Вораг страціў пры гэтым каля двух батальёнаў пяхоты, каля ста гітлераўцаў здаліся ў палон. Таго ж афіцэра сярод палонных не аказалася. Потым яго труп апазналі на гарадской плошчы.

Але дзе ж калона ўгнаных фашыстамі з Хоцімска савецкіх людзей?

Камандзір палка Грэчка аддаў загад камандзіру стралковай роты старшаму лейтэнанту Міхаілу Парфір’евічу Яварскаму высветліць гэта пытанне і прыняць меры да выратавання калоны. Выконваючы загад, той пасадзіў на тры танкі аўтаматчыкаў і сам на галоўной машыне адправіўся даганяць. Кіламетрах у пяці ад Хоцімска ён дагнаў калону. З галаўнога танка зрабілі два выстралы ўздоўж дарогі — справа і злева. Нямецкая ахова кінулася ўрассыпную. Два нашых танкі падыйшлі да калоны. Жанчыны са слязамі радасці абдымалі савецкіх салдат. Хто не мог праціснуцца, той цягнуўся і лашчыў рукой зашмальцаваны, дарагі і мілы рускі шынель.

Зварушлівым было відовішча і ў цэнтры Хоцімска. Некалькі соцень яго жыхароў і байцоў змяшаліся, плошча гудзела магутным пчаліным вуллем. Наўкола ўсё яшчэ напамінала аб нядаўніх жорсткіх баях: пустыя вокны, пабітыя асколкамі і кулямі сцены, зброя гітлераўцаў і іх трупы пад нагамі...

Але ўсе гэтыя цяжкія падрабязнасці вайны адступілі ўжо. Людзі нібы і не заўважалі іх цяпер, яны бачылі другі твар вайны — вызваленне. Абдымкі, радасць, слёзы... І ў давяршэнне падыйшлі тыя тры танкі «Т-34» з групы Яварскага. На іх ужо не было аўтаматчыкаў: на бране сядзелі... дзеці. Не так даўно яшчэ іх, маці неслі на руках, падганяемыя фашысцкімі людаедамі. Яны былі схуднелыя і брудныя. Але колькі шчасця было цяпер у іх ззяючых вачах!

Раптам плошча стала сціхаць. Людзі перасталі плакаць і смяяцца. Аўтаматчыкі 539-га палка канваіравалі палонных. Мінутная цішыня парушылася вокрыкамі: «Біце іх, гадаў!». Адбылося нешта незвычайнае. Жанчыны ламалі частакол, хапалі камяні. Усё гэта паляцела ў бок гітлераўскіх ваяк. Натоўп грозна насоўваўся.

Савецкія байцы навялі парадак, не абразіўшы пачуцця святой ненавісці да ворага. Аднак пачуцці былі вельмі моцнымі. Яны павінны былі выліцца. Калі калона палонных зноў рушыла, перад ёю на дарогу выскачыла дзяўчына. Яна ішла ўперадзе, тварам да немцаў, водзячы плячыма, прытанцоўвала сваімі тонкімі, амаль разутымі нагамі і выкрыквала частушкі. Слоў нельга было разабраць за гулам натоўпу, і толькі відаць была яе фігурка, расхістаныя полы паліто ды рукі, ўзбуджана ўзлятаючыя ўгару. Адусюль ляцелі галасы адабрэння. Непадалёк стаяў ля пажылой жанчыны наш салдат. Ён трымаў у сваіх руках высока над галавой хлапчука, каб той бачыў, што робіцца. А сам прыгаворваў: «Ай, уцешыла! Ну, малыш, і сястрычка ў цябе!». Гэта быў Анемпадыст Уладзіміраў. А дзяўчынай той была Маруся Шылава. У яе ў той час былі маці і брацік.

Так першым стрэў зару свабоды наш Хоцімск — родны гарадок.

Хутка ў Хоцімск прыбылі прадстаўнікі ЦК Кампартыі Беларусі і ўрада рэспублікі.

У вызваленым Хоцімску пачалося зноў мірнае, стваральнае жыццё.

**Севелеў, Л.** Ты першым стрэў свабоду : [аб вызваленні Хоцімска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў] / Леў Севелеў // Шлях Кастрычніка. — 1995. — 26 красавіка. — С. 2.